Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 2 (89), 2015

*УДК 94:340.132.6:347.6:272/.273(476)“18/19”*

# Прымяненне нормаў сямейнага права Рымска-каталіцкай Царквы ў Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.)

А.П. Грахоцкі

Разглядаецца прымяненне нормаў кананічнага права Рымска-каталіцкай Царквы ў рэгуляванні шлюбна-сямейных адносін на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст., аналізуюцца асновы прававой рэгламентацыі парадку заключэння і скасавання шлюбу асобамі каталіцкага веравызнання, прыводзяцца характэрныя прыклады з практыкі царкоўнага суда Магілёўскай рымска-каталіцкай епархіі.
**Ключавыя словы:** царкоўнае права, Рымска-каталіцкая Царква, беларускія землі, Расійская імперыя, заканадаўства, шлюб, развод, кансісторыя.

The application of canon law of the Roman Catholic Church in the regulation of marriage and family relations on the territory of Belarus in the second half of the XIX – beginning of the XX century is discussed. The foundations of legal regulation of the order of marriage and divorce of persons of Catholic religion are analyzed. Typical examples of the practice of the ecclesiastical court of Mogilev Roman Catholic diocese are presented.
**Keywords:** ecclesiastical law, Roman Catholic Church, territory of Belarus, Russian Empire, legislation, marriage, divorce, consistory.

З часоў прыняцця Хрысціянства ў Старажытнай Русі Царква прымала на сябе ролю рэгулятара шлюбна-сямейных адносін. Старажытнарускія прававыя зборнікі (Статуты Уладзіміра Святаславіча, Яраслава Мудрага і інш.) толькі пацвярджалі легітымнасць царкоўных нормаў у дадзенай сферы [1, с. 61]. Таксама і нормы «Свода законов Российской империи» (т. 10, ч. 1 «Законы гражданские») і «Устава духовных консисторий» (1841 г.), якія рэгулявалі парадак заключэння і скасавання шлюбу асоб праваслаўнага веравызнання, толькі субсідыярна ахоўвалі рэлігійна-маральныя асновы шлюбна-сямейных адносін. Адпаведны функцыянал у дачыненні да неправаслаўных падданых Расійскай дзяржавы даручаўся кліру тых канфесій, да якіх належалі суб’екты шлюбна-сямейных адносін. У «Законах гражданских» адзначалася: «… брак же во всех вероисповеданиях, терпимых в Российской Империи… признаётся законным, когда оный совершён по обрядам их веры и по установленным правилам» [2, ст. 1112, 61]. Такім чынам, рэгуляванне парадку заключэння і скасавання шлюбу католікаў, якія пражывалі на тэрыторыі імперыі, ажыццяўлялася на падставе нормаў рымска-каталіцкага царкоўнага права.

У сучаснай гістарыяграфіі даволі падрабязна разгледжаны пытанні прававога рэгулявання шлюбна-сямейных адносін праваслаўных падданых Расійскай імперыі [3]–[7]. У той жа час праблемы прымянення нормаў рымска-каталіцкага сямейнага права ў адзначаны перыяд не знайшлі шырокага даследчыцкага асвятлення. Істотны ўклад у распрацоўку праблемы ўнесла расійская даследчыца В.А. Ліцэнбергер [8], [9]. Аднак пытанні прымянення нормаў рымска-каталіцкага царкоўнага права ў рэгуляванні шлюбна-сямейных адносін на беларускіх землях застаюцца не даследаванымі ў айчыннай гісторыка-прававой навуцы. Таму мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца адлюстраванне на падставе аналізу архіўных матэрыялаў працэсу прымянення нормаў сямейнага права Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст.

Асноўнай крыніцай, якая рэгулявала шлюбна-сямейныя адносіны каталіцкіх вернікаў у даследуемы перыяд, з’яўляўся «Corpus Iuris Canonici», зацверджаны Папам Рыгорам XIII у 1580 г. [10]. Здзяйсненне таямніцы шлюбу ў Рымска-каталіцкай Царкве рэгламентавалася пастановай Трыдэнцкага сабора. Згодна з «Decretum de reformatione matrimonii» ад 11 лістапада 1563 г., законным прызнаваўся шлюб, узяты ў касцёле ў прысутнасці святара і двух сведкаў [10].

Рымска-каталіцкая Царква адмаўляла магчымасць разводу. Згодна з кананічнымі нормамі, шлюбны саюз мог быць спынены толькі са смерцю аднаго ці абодвух сужэнцаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГОМЕЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМ. Ф. СКОРИНЫ

[10]. Царкоўнае права адрознівала кансуміраваны і некансуміраваны шлюб. Кансуміраваны шлюб, г. зн. «завершённый плотским сожитием супругов», мог быць скасаваны толькі па двух прычынах: 1) калі абодва сужэнцы жадалі прыняць манаства; 2) калі адзін з двух сужэнцаў-нехрысціян прымаў каталіцтва, а другі не жадаў працягваць з ім сужэнства. Некансуміраваны шлюб (паміж сужэнцамі адсутнічала палавая сувязь) мог быць скасаваны на падставе жадання аднаго з сужэнцаў прыняць манаскі пострыг [11, с. 386].

Так, адзінай магчымасцю для мужа і жонкі, якія не жадалі жыць разам і імкнуліся ўзяць новы шлюб, было доказванне несапраўднасці і незаконнасці іх саюза, што цягнула за сабой яго ануляванне. У адваротным выпадку падданыя-католікі маглі разлічваць толькі на сепарацыю – на разлучэнне сужэнцаў ад «стола и ложа». Сепарацыя прызначалася духоўным судом пажыццёва ці на канкрэтна вызначаны тэрмін, але ў абодвух выпадках шлюбныя повязі не перарываліся, адпаведна разлучаныя сужэнцы пазбаўляліся магчымасці ўзяць новы шлюб. Падставамі для сепарацыі маглі быць наступныя жыццёвыя абставіны: пралюбадзейства мужа ці жонкі, пераход аднаго з сужэнцаў у іншае веравызнанне (да моманту яго вяртання ў каталіцтва), жорсткае абыходжанне аднаго сужэнца з другім, небяспечнае захворванне мужа ці жонкі, здзяйсненне адным з сужэнцаў крымінальнага злачынства і некаторыя іншыя [11, с. 386]. Напрыклад, жыхарка горада Гомеля Паўліна Зноска ў 1865 г. скардзілася ў Магілёўскую рымска-каталіцкую кансісторыю на жорсткі характар свайго мужа і прасіла часова разлучыць яе з сужэнцам [12, арк. 18–19]. Праз 8 месяцаў выйшла рашэнне кансісторыі, згодна з якім Паўліне і Антону Зноскам давалася сепарацыя «впредь до примирения» [12, арк. 48].

Значна больш складаным быў парадак прызнання шлюбу несапраўдным. Дадзены працэс пачынаўся з падачы ў рымска-каталіцкую епархіяльную кансісторыю прашэння ад аднаго з сужэнцаў аб прызнанні яго шлюбу незаконным. Пасля атрымання адпаведнага прашэння кансісторыя накіроўвала просьбіта ў яго парафіяльны касцёл, дзе апошні мусіў выконваць дзесяцідзённыя духоўныя рэкалекцыі (малітвы) са споведдзю і прычашчэннем. Калі ісцец за час «увещания» не змяняў жадання ануляваць шлюб, распачыналася папярэдняе следства. Кансісторыя прызначала з ліку духоўных асоб двух следчых, а таксама дэфенсара – абаронцу шлюбных повязяў [13, арк. 1–23], [14, арк. 26 і адв.]. На падставе сабраных матэрыялаў следства кансісторыя рыхтавала рашэнне па справе, якое перадавалася на зацвярджэнне епіскапу. Пасля таго як апошні зацвярджаў ці адхіляў рашэнне кансісторыі, справа ў абавязковым парадку перадавалася на разгляд у другую інстанцыю [15, арк. 2–4 адв.].

Згодна са Статутам Рымска-каталіцкай Царквы, другой інстанцыяй па справах аб ануляванні шлюбаў быў архіепіскап-мітрапаліт [16, ст. 60]. Так, пры Магілёўскім мітрапаліце існаваў Мітрапаліцкі савет па справах шлюбных і іншага роду духоўных справах. Склад гэтага савета вызначаўся мітрапалітам. Напрыклад, у 1893 г. у савет пры мітрапаліце С. Казлоўскім уваходзілі чатыры духоўныя асобы: старшыня – епіскап-суфраган, спецыяліст у галіне кананічнага права, канонік і дэфенсар [14, арк. 67]. Рашэнні ў гэтым органе прымаліся большасцю галасоў. Разгледжаныя саветам справы накіроўваліся на зацвярджэнне мітрапаліту [14, арк. 91]. У выпадку, калі рашэнні духоўнага суда першай інстанцыі і мітрапаліта не супадалі, апошняй інстанцыяй па разглядзе справы з'яўляўся Папа Рымскі. Калі ж рашэнні першай і другой інстанцый супадалі і абодва сужэнцы былі імі задаволены, справа не падлягала перагляду. У адваротным выпадку незадаволены бок меў права на апеляцыю да Святога Прастола [16, ст. 60]. Другой інстанцыяй для спраў, што першапачаткова разглядаліся ў Магілёўскай духоўнай кансісторыі, была іншая кансісторыя, якая вызначалася спецыяльнай булай Пантыфіка [16, ст. 60], [14, арк. 66 і адв.].

Вышэй апісаны парадак быў прапісаны ў канкардаце 1847 г. паміж Святым Прастолам і Расійскай імперыяй. Аднак пасля таго, як у 1866 г. канкардат быў разарваны, расійскія ўлады ініцыявалі іншую схему: пасля разгляду шлюбных спраў у першай інстанцыі рашэнне накіроўвалася ў Санкт-Пецярбург у Духоўную калегію, якая ўласным рашэннем вызначала другую інстанцыю. У выпадку, калі рашэнні духоўных судоў першай і другой інстанцый не супадалі, канчатковы разгляд ажыццяўляўся не Папам Рымскім, а Духоўнай калегіяй. Аднак у 1875 г. імператар Аляксандр II пагадзіўся на аднаўленне кананічнага парадку (прапісанага

РЕПОЗИТОРИЙ ГОМЕЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМ. Ф. СКОРИНЫ

ў канкардаце) разгляду шлюбных спраў [14, арк. 4 адв., 24 і адв.].

Звернемся да разгляду падстаў, якія вялі да анулявання шлюбу. У артыкуле 62 «Законов гражданских» адзначалася, што падставы для прызнання шлюбу несапраўдным, вызначаныя ў дачыненні да праваслаўных падданых (артыкул 37 гэтага ж заканадаўчага акта), распаўсюджваюцца на шлюбы паміж прадстаўнікамі «замежных» хрысціянскіх веравызнанняў (г. зн. і на рымскіх католікаў) «в той мере, как сие узаконениями для тех исповеданий постановлено» [2, ст. 62].

Згодна з кананічнымі нормамі абедзвюх Цэркваў (Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай), галоўнай умовай законнасці шлюбу з'яўлялася згода жаніха і нявесты [17, с. 285], [10]. Таму ануляванню падлягаў шлюб, заключаны з выкарыстаннем гвалту. Артыкул 12 «Законов гражданских» рэгламентаваў: «Брак не может быть законно совершён без взаимного и непринуждённого согласия сочетающихся лиц; посему запрещается родителям своих детей и опекунам лиц, вверенных их опеке, принуждать ко вступлению в брак против их желания» [2, с. 2]. «Уложение о наказаниях уголовных и исправительных» устанаўлівала крымінальную адказнасць за прымус да ўзяцця шлюбу [18, ст. 1550, 1586].

Так, у Магілёўскую рымска-каталіцкую духоўную кансісторыю неаднаразова звярталіся жанчыны з просьбамі аб прызнанні іх шлюбу незаконным у сувязі з тым, што яны выходзілі замуж пад прымусам [13, арк. 1–2], [15, арк. 1 і адв.], [19, арк. 1–12 ], [20, арк. 1 і адв.]. Напрыклад, дваранка Марыя Багуслаўская ў 1901 г. здолела пераканаць Магілёўскую кансісторыю ў тым, што яна ўзяла шлюб з дваранінам Емельянам Багуслаўскім пад прымусам свайго бацькі. У пастанове Цяльшэўскай кансісторыі, якая разглядала справу ў якасці суда другой інстанцыі, адзначалася: шлюб адбыўся «не по вольной воле» ісціцы, «<…> а под влиянием нравственного давления ея отца, угрозы которого изгнать из дома и лишить наследства <…> поработили окончательно ея волю и заставили её <…> вступить в брак с человеком, к которому она чувствовала непреодолимое отвращение и с которым она <…> в продолжение всей совместной жизни имела только принуждённые плотские сношения» [20, арк. 104].

Паводле нормаў царкоўнага права, «шаленства» жаніха ці нявесты (альбо абодвух) падчас заключэння шлюбу пазбаўляла хворую асобу магчымасці свядомага і свабоднага самавызначэння волі [10]. Таму падставай для анулявання шлюбу магло служыць доказванне таго, што на момант заключэння шлюбу сужэнец меў псіхічнае захворванне.

Наступнай падставай для прызнання шлюбу незаконным была наяўнасць роднасных альбо сваяцкіх сувязяў паміж сужэнцамі. У артыкулах 23 і 64 «Законов гражданских» акрэслівалася: асобам хрысціянскіх веравызнанняў не дазваляецца браць шлюб у ступенях роднасці і сваяцтва, «возбранённых правилами той Церкви, к коей принадлежат сочетающиеся лица» [2, сс. 2, 7].

Для рымскіх католікаў недапушчальнымі з'яўляліся шлюбы пры наяўнасці кроўнай роднасці – да чацвёртай ступені ўключна. Пад кроўнай роднасцю разумелася блізкасць, якая ўзнікае ці з паходжання адной асобы ад другой, ці з паходжання абедзвюх ад агульнага роданачальніка. Згодна з правіламі Рымска-каталіцкай Царквы, ступені роднасці лічыліся па генерацыях. Так, родныя браты, якія складалі першую генерацыю ад сваіх бацькоў, знаходзіліся ў першай ступені роднасці, стрыечныя – у другой, траюрадныя – у трэцяй і г. д. [21, с. 254–255].

Сваяцтва (пад якім разумеліся адносіны блізкасці, заснаваныя на шлюбе дзвюх асоб, што належалі да розных родаў) з'яўлялася перашкодай для шлюбу толькі паміж адным сужэнцам і роднымі другога (да чацвёртай ступені), але не паміж роднымі сужэнцаў. Так, напрыклад, шлюб паміж братам аднаго сужэнца і сястрой другога не з'яўляўся парушэннем каталіцкіх кананічных нормаў [14, арк. 52].

Выкананне царкоўных правілаў аб забароне браць шлюб у вызначаных ступенях роднасці і сваяцтва забяспечвалася крымінальным заканадаўствам [18, ст. 1559, 1593, 1594]. Напрыклад, у 1886 г. у Мінскім акруговым судзе разглядалася справа аб кровазмяшэнні падданага-католіка Юрыя Зароўскага з яго пляменніцай Міхалінай і ўдавой яго брата Антанінай. У сувязі з гэтым суд звярнуўся ў Магілёўскую рымска-каталіцкую духоўную кансісторыю з запытам, ці магчымы, згодна з кананічнымі нормамі, шлюб паміж гэтымі асобамі [22, арк. 1, 17–20 адв.]. Кансісторыя дала адмоўны адказ: Ю. Зароўскі са сваёй пляменніцай знаходзіцца ў другой ступені роднасці, а з удавой брата – у першай ступені

РЕПОЗИТОРИЙ ГОМЕЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМ. Ф. СКОРИНЫ

сваяцтва [22, арк. 12 і адв., 21–22]. У выніку суд прыгаварыў Зароўскага да заключэння ў папраўчыя арыштанцкія роты на 2 гады і 9 месяцаў, яго пляменніцу – да аднаго года турэмнага зняволення, а ўдаву Зароўскую – да заключэння ў манастыр на 6 месяцаў. У адпаведнасці з прыгаворам суда кансісторыя прызначыла вінаватым царкоўнае пакаянне (епітым'ю): Юрыю тэрмінам на 2 месяцы, жанчынам – на 45 дзён [22, арк. 24–26 адв.].

Падставай для прызнання шлюбу незаконным лічылася і мнагажэнства ці мнагамужжа асобы. Згодна з кананічнымі нормамі, асобе, якая знаходзілася ў шлюбным саюзе, забаранялася браць новы шлюб [8, с. 35]. У адпаведнасці з гэтым узяцце новага шлюбу «падчас існавання ранейшага» прызнавалася расійскім крымінальным правам злачынствам супраць шлюбу [18, ст. 1554, 1555]. Трэба адзначыць, што абвінавачванне асобы ў мнагашлюбнасці не вяло да скасавання яе першага (законнага) шлюбу. Згодна з правіламі Рымска-каталіцкай Царквы, першы шлюб адназначна захоўваў сваю сілу [23, арк. 5–12 адв.].

Падставай для прызнання несапраўднасці шлюбу закон называў недасягненне ўзросту, «вызначанага Царквой для ўзяцця шлюбу». У Расійскай імперыі існавалі два варыянты вызначэння ўзросту, з якога дазвалялася браць шлюб: царкоўны і грамадзянскі. Нормы рымска-каталіцкага царкоўнага права акрэслівалі наступны мінімальны ўзрост для ўзяцця шлюбу: для мужчын – 14 год, для жанчын – 12. Аднак 19 ліпеня 1830 г. Мікалай I падпісаў указ, у адпаведнасці з якім шлюбны ўзрост для мужчын узнімаўся да 18 гадоў, для жанчын – да 16 [24, с. 8–9]. Як адзначалася ў артыкуле 63 «Законов гражданских», мінімальна дапушчальны ўзрост для ўзяцця шлюбу, вызначаны ўказам імператара, акрамя праваслаўных падданых, распаўсюджваўся і на асоб рымска-каталіцкага, евангеліка-лютэранскага, армяна-грыгарыянскага веравызнанняў [2, с. 7].

Аднак прававая норма, санкцыянаваная манархам, канчаткова не выцесніла царкоўную. Так, у артыкуле 3 «Законов гражданских» адзначалася, што свяшчэннаслужыцелям забараняецца вянчаць асоб, якія не дасягнулі грамадзянскага паўналецця [2, с. 3]. У той жа час, згодна з артыкулам 37 гэтага ж дакумента, незаконным прызнаваўся толькі той шлюб, які заключаўся раней царкоўнага паўналецця [2, ст. 4]. Гэта значыць, што шлюбы, заключаныя паміж асобамі, якія дасягнулі толькі царкоўнага, але не грамадзянскага паўналецця, не падлягалі ануляванню [2, ст. 39]. Як адзначыла ў сваім даследаванні В.А. Ліцэнбергер, нягледзячы на ўказ імператара, рымска-каталіцкія вернікі даволі часта бралі шлюб у 12–13 гадоў [8, с. 35].

У адпаведнасці з канонамі Рымска-каталіцкай Царквы, акрамя дасягнення шлюбнага ўзросту, абавязковай умовай для ўзяцця шлюбу было праходжанне жаніхом і нявестай канфірмацыі і далучэнне да святых таінстваў. Каталіцкім святарам загадвалася не вянчаць маладых да паспяховай здачы імі экзамена на веданне Катэхізіса, малітваў і Евангелля [8, с. 35]. Як правіла, парафіяне праходзілі канфірмацыю ў 13–14 гадоў, што азначала іх канчатковае далучэнне да царкоўнай абшчыны.

Незаконнымі прызнаваліся шлюбы асоб рымска-каталіцкага веравызнання з нехрысціянамі. Згодна з крымінальным заканадаўствам, католікі за ўзяцце такога шлюбу караліся турэмным зняволеннем на 2 месяцы і 20 дзён [18, ст. 1568].

Такім чынам, рэгуляванне шлюбна-сямейных адносін на беларускіх землях, як і ў іншых рэгіёнах Расійскай імперыі, у другой палове XIX – пачатку XX ст. па-ранейшаму знаходзілася ў юрысдыкцыі афіцыйна прызнаных у дзяржаве канфесій. Парадак заключэння і скасавання шлюбу падданых каталіцкага веравызнання ажыццяўляўся на падставе нормаў рымска-каталіцкага кананічнага права, якія толькі субсідыярна ахоўваліся заканадаўствам Расійскай імперыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГОМЕЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМ. Ф. СКОРИНЫ

## Літаратура

1. Победоносцев, К. Курс гражданского права : в 3 ч. / К. Победоносцев. – СПб. : Синод. тип., 1896. – Ч. 2 : Права семейственные наследственные и завещательные. – 676 с.

2. Свод законов Российской империи : в 16 т. – СПб. : тип. 2 отд. Собств. ЕИВ канц., 1857–1903. – Т. 10, ч. 1 : Законы гражданские. – 1900. – 385 с.

3. Белякова, Е.В. Церковный суд и проблемы церковной жизни / Е.В. Белякова. – М. : КЦ «Ду-

ховная библиотека», 2004. – 664 с.

4. Фриз, Г. Мирские нарративы о Священном таинстве: брак и развод в позднеимперской России / Г. Фриз // Православие : конфессия, институты, религиозность (XVII–XX вв.) : сб. науч. раб. / под ред. М. Долбилова, П. Рогозного. – СПб. : изд-во Европ. ун-та в Санкт-Петербурге, 2009. – С. 122–175.

5. Грахоцкі, А.П. Нормы царкоўнага права ў шлюбаразводным працэсе другой паловы XIX–пачатку XX ст. (па матэрыялах Мінскай епархіі) / А.П. Грахоцкі // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. – 2010. – № 3. – С. 55–67.

6. Грахоцкі, А.П. Прымяненне нормаў царкоўнага права ў рэгуляванні парадку заключэння шлюбу ў Беларусі (другая палова XIX–пачатак XX ст.) / А.П. Грахоцкі // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2010. – № 5. – С. 139–146.

7. Яненко, О.Ю. Расторжение брака в Российской империи на рубеже XIX–XX вв. / О.Ю. Яненко // Вестник Южно-Уральского государственного университета. Серия социально-гуманитарных наук. – 2013. – № 1. – С. 192–194.

8. Лиценбергер, О.А. Применение норм семейного права Римско-католической церкви в Российской империи / О.А. Лиценбергер // Религия и право. – 2003. – № 1. – С. 34–37.

9. Лиценбергер, О.А. Римско-католическая Церковь в России : история и правовое положение / О.А. Лиценбергер. – Саратов : Поволж. академия гос. службы, 2001. – 384 с.

10. Джероза, Л. Каноническое право в Католической Церкви [Электронный ресурс] / Л. Джероза. – М. : «Христ. Россия», 1998. – Режим доступа : http://searchebookonline.com/book_485.html. – Дата доступа : 1.09.2011.

11. Суворов, Н. Учебник церковного права / Н. Суворов. – М. : Печ. А.И. Снегирёвой, 1912. – 531 с.

12. Дело по рапорту Гомельского декана о сепарации супругов Зноско. 1866 г. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 3. – Спр. 6910.

13. Дело о расторжении брака супругов графов Михаила и Марии княжны Радзивилл Тышкевичей. 1884 г. // НГАБ у Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 1. – Спр. 8918.

14. Директивы и инструкции о соблюдении законов по бракоразводным делам 1868–1917 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 28. – Спр. 176.

15. Дело во вторую инстанцию духовного суда о расторжении брака супругов Аркадия и Амелии Корвин-Коссаковских. 1902 г. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 21. – Спр. 44.

16. Свод законов Российской империи: в 16 т. – СПб. : тип. 2 отд. Собств. ЕИВ канц., 1857–1903. – Т. 11, ч. 1 : Уставы духовных дел иностранных исповеданий. – 1857. – 156 с.

17. Оршанский, И.Г. Исследования по русскому праву обычному и брачному / И.Г. Оршанский. – СПб. : тип. А.Е. Ландау, 1879. – 456 с.

18. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных // Свод законов Российской империи: в 16 т. – СПб. : тип. 2 отд. Соб. ЕИВ канц., 1857–1903. – Т. 15. – 1885. – С. 1–202.

19. Дело о недействительности брака супругов Викентия и Аполонии Гарбулев. 1901–1916 гг. // НГАБ у Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 21. – Спр. 14.

20. Дело о расторжении брака дворян Марии и Емельяна Богуславских. 1904 г. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 21. – Спр. 31.

21. Павлов, А.С. Курс церковного права / А.С. Павлов. – СПб. : Изд-во «Лань», 2002. – 384 с.

22. Дело о кровосмешении Юрия Заровского с женою брата Станислава. 1887 г.// НГАБ у г. Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 20. – Спр. 16.

23. Дело о двоебрачии Владимира Эльяшевича 1884 г. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 20. – Спр. 12.

24. Загоровский, А.И. Курс семейного права / А.И. Загоровский – М. : «Зерцало», 2003. – 464 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГОМЕЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 18.12.2014